Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
____________ С. Л. Шпарло
«___» ____________ 2021 г.
Рэгістрацыйны №ВД-____ /вуч.

# БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 11*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2021

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі Iступені ОСВО 1-23 01 11-2014 па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), вучэбных планаўустановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках). Рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-90/17 вуч. ад 04.07.2017, Е 23-1-88/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК**
*В.І.Саітава,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*І. П. Лазарава,* намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоцедзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»;
*В. А. Касап,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**:
*кафедрай*бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 25.09.2020);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 14.10.2020)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. І. Саітава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства»звязана з узрастаннем значэння краязнаўчай дзейнасці бібліятэк ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай рэальнасці, трансфармацыі камунікатыўнага асяроддзя, форм і тэхналогій прадстаўлення інфармацыі і доступу да яе. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства скіравана на задавальненне і развіццё рэгіянальных інфармацыйных патрэбнасцей, прадстаўленне рэгёнаў укультурнай і медыйнай прасторы краіны і свету. Кампетэнтнасць у галіне краязнаўства стала важнай рысай якаснай прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкара-бібліёграфа. Для сучаснага спецыяліста важна ўсведамляць значэнне інфармацыйных аб’ектаў, фіксуючых краязнаўчыя веды, прыналежных да культурных каштоўнасцей рэгіёна, ідэнтыфікаваць іх, апрацоўваць, захоўваць і прадстаўляць у камунікатыўных фарматах, ствараць асветніцкія, адукацыйныя і навуковыя бібліятэчныя праекты, выкарыстоўваць маркетынгавыя і рэкламныя інструменты для іх прамоцыі. Сусветная бібліятэчная практыка сведчыць аб патрэбнасці ў падрыхтоўцы кадраў да дзейнасці па напрамку краязнаўства.«Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» ўваходзіць у склад вучэбных дысцыплін адукацыйнай праграмы для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Яна распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» з’яўляецца вывучэнне студэнтамі тэарэтыка-метадалагічных, арганізацыйных, метадычных і тэхналагічных пытанняў краязнаўчай дзейнасці бібліятэк; фарміраванне ўменняў і навыкаў па стварэнні і выкарыстанні краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў; засваенне бібліятэчна-бібліяграфічных форм і метадаў давядзення краязнаўчых ведаў да карыстальнікаў.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны абумоўлівае вырашэнне кола *задач*:

– засваенне тэарэтычных і метадалагічныхасноў бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, яго тэрмінасістэмы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– асэнсаванне грамадскай ролі краязнаўства, яго структуры, форм і кірункаў;

– асэнсаванне арганізацыйных асаблівасцей краязнаўчай дзейнасці бібліятэк;

– авалоданне тэхналогіяй і методыкай форм і працэсаў краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі ў розных камунікатыўных фарматах;

– асэнсаванне асобаснай прафесіянальнай і грамадзянскай адказнасці будучага бібліятэкара-бібліёграфа за захаванне і трансляцыю культурных дасягненняў рэгіёна.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый адпаведна адукацыйнаму стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай на камп'ютары.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК- 7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя тэхналагічныя працэсы ў асяроддзі сучасных АБІС.

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне розных груп карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пералічаныя кампетэнцыі прадугледжваюць фарміраванне наступных ведаўі ўменняў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя тэарэтычныя палажэнні і паняцці бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– узнікненне і этапы гістарычнага развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў культурнай прасторы Беларусі;

– прынцыпы рэгіянальнага структуравання тэрыторыі Беларусі;

– сутнасць, структуру і асноўныя кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства;

– асаблівасці краязнаўчых дакументаў і іншых інфармацыйных аб’ектаў;

– патрэбнасціспажыўцоў у краязнаўчай інфармацыі;

– формы існавання краязнаўчых бібліятэчна-інфармацыйных рэсурсаў, тэхналогію іх стварэння і выкарыстання ў абслугоўванні карыстальнікаў;

– кірункі прамоцыі краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі, вынікаў яе праектнай і пошукава-даследчай дзейнасці ў розныя грамадскія кантэксты і інтэрнэт-прастору;

*умець:*

– фарміраваць краязнаўчы фонд і краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі;

–ствараць краязнаўчыя калекцыі і інфармацыйныя прадукты, дакладнавызначаць іх змест і форму;

– рэалізаваць розныя віды бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве;

– забяспечваць доступ да лічбавых інфармацыйных рэсурсаў па краязнаўстве ў Інтэрнэце;

– аналізаваць стан краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі;

– каардынаваць краязнаўчую дзейнасць бібліятэкіз навукова-даследчымі і вучэбнымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі;

– выкарыстоўваць інструменты маркетынгу і камунікацыі для прамоцыі краязнаўчых ведаў і ўзаемадзеяння з карыстальнікамі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– методыкай і тэхналогіямі стварэння краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і паслуг у традыцыйных і лічбавых камунікатыўных фарматах;

– метадамі дакладнага вызначэння інфармацыйных патрэбнасцей спажыўцоў па краязнаўстве;

– методыкай і тэхналогіямі прамоцыі краязнаўчых ведаў, усталявання сувязей з грамадскасцю для рэалізацыі мерапрыемстваў і праектаў бібліятэкі па краязнаўстве;

– метадамі пошукава-даследчай дзейнасці па краязнаўстве ў межах бібліятэкі і бібліяграфіі як сацыяльных інстытутаў грамадства.

Вучэбная дысцыпліна мае практыка-арыентаваны характар і вызначаецца трывалымі сувязямі з дысцыплінамі агульнапрафесійнага і спецыяльнага цыклаў: «Дакументалогія», «Бібліятэказнаўства», «Бібліяграфазнаўства» і інш.

У працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства»выкарыстоўваюцца перадавыя педагагічныя методыкі і тэхналогіі: тэхналогія модульнага навучання; тэхналогія праблемнага навучання; камунікатыўныя і інфармацыйныя тэхналогіі, тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый, іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» ўсяго прадугледжана 150 гадзін, з якіх 70 гадзін – аўдыторныя заняткі (28гадзін – лекцыі, 18гадзін – практычныя заняткі, 10– семінарскія заняткі, 14 – лабараторныя заняткі).

Рэкамендаванай формай выніковага кантролю ведаў студэнтаў з’яўляецца экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Прадмет, структура, задачы вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства». Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў. Веды,уменні і навыкі, якія набываюць студэнты ў працэсе вывучэння дысцыпліны. Узаемасувязі вучэбнай дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства»з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі. Асноўныя формы аўдыторнай і пазааўдыторнай работы пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя формы кантролю: бягучыя, прамежкавыя і выніковыя. Характарыстыка вучэбна-метадычнай забяспечанасці дысцыпліны.

## Раздзел I. Краязнаўства як грамадская з’ява

### *Тэма 1. Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства*

Сутнасць краязнаўства як грамадскай з’явы, яго аб’ект. Азначэнне паняцця «краязнаўства». Комплекснае і галіновае краязнаўства. Задачы краязнаўства ў розных грамадскіх сферах. Асаблівасці краязнаўчага вывучэння мясцовасці. Арганізацыйныя формы краязнаўства. Суб’ект краязнаўства. Краязнаўства як галіна навуковых ведаў. Крыніцы і метадалагічны патэнцыял краязнаўства.

Даследчыкі айчыннага краязнаўства (М. І. Каспяровіч, Г. А. Каханоўскі, Л. В. Аляксееў, А. У. Дзянісаў, М. В. Півавар і інш.).

### *Тэма 2. Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах*

Характарыстыка прымет, па якіх здзяйсняецца падзел краіны на рэгіёны (адміністрацыйна-тэрытарыяльная, прыродная, эканамічная,канфесійная і інш.).Значэнне адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу краіны. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель у ВКЛ і Расійскай імперыі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзелу БССР і ў Рэспубліцы Беларусь. Значэнне прыродна-геаграфічнага раяніравання і прыметы, па якіх яно ажыццяўляецца. Асноўныя прыродна-геаграфічныя правінцыі: Беларускае Паазер'е, Беларуская Узвышанасць, Перадпалессе, Прыдняпроўе (Усходне-Беларуская правінцыя), Палессе. Прыродныя запаведнікі і заказнікі.

### *Тэма 3. Узнікненне і асноўныя этапы развіцця беларускага краязнаўства*

Выдзяленне асноўных этапаў беларускага краязнаўства на падставе асноўных перыядаў айчыннай гісторыі і развіцця ўласна краязнаўчай дзейнасці.

Узнікненне і развіццё навуковага краязнаўства ў XVI–XVIII стст. (прыродазнаўчага: Ж. Э. Жылібер, С. Б. Юндзіл і гістарычнага: А. Гваньіні, М. Стрыйкоўскі, І. Сцябельскі).

Краязнаўчы рух у XIX – пачатку XX ст. Краязнаўчыя аматарскія арганізацыі (Віленскі музей старажытнасцей і археалагічная камісія пры ім, Віцебская губернская вучоная архіўная камісія і інш.). Роля губернскіх статыстычных камітэтаў.Кірункі даследаванняў розных змястоўных напрамкаў (З. Даленга-Хадакоўскі, К. Тышкевіч, Я. Тышкевіч, А. Кіркор, М. Я. Нікіфароўскі, Е. Р. Раманаў, А. П. Сапуноў, Э. Гутэн-Чапскі і інш.).

Уздым краязнаўства ў БССР у 1920-я гг. і яго арганізацыя. Роля Цэнтральнага бюро краязнаўстваапры Інбелкульце. Краязнаўчы друк, часопіс «Наш край». Кірункі пошукава-даследчай дзейнасці. Арганізацыя краязнаўства на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.Развіццё арганізацыйнай структуры краязнаўства ў БССР у пасляваенны перыяд, кірункі даследаванняў. Стварэнне і дзейнасць Беларускага краязнаўчага таварыства.

Інстытуцыянальныя формы сучаснага краязнаўства:грамадскага, дзяржаўнага, школьнага. Краязнаўчы друк, «Краязнаўчая газета», краязнаўства ў сацыяльных медыя. Пашырэнне змястоўных напрамкаў краязнаўчых даследаванняў. Выдатныя сучасныя краязнаўцы (А. І. Бутэвіч, У. А. Гілеп, А. П. Грыцкевіч, Г. А. Каханоўскі, У. А. Ліхадзедаў, А. І. Мальдзіс, В. У. Скалабан, А. М. Карлюкевіч, М. В. Півавар, С. В. Суднікі інш.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Асноўныя этапы развіцця і інтэгравання айчыннага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства*

Узнікненне латэнтных форм краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі як неад'емных элементаў беларускіх выданняў у XVII – першай палове XIX ст.З'яўленне самастойных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, стварэнне краязнаўчых фондаў у бібліятэках і краязнаўчых бібліятэк у перыяд сярэдзіны XIX ст. – да 1920-х гг. Бібліятэка Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі, бібліятэка Віцебскай вучонай архіўнай камісіі.

Развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў БССР у міжваенны перыяд. Бібліяграфічныя рэсурсы для забеспячэння развіцця навукі і эканомікі ў 1920-я гг.Фарміраванне фондаў краязнаўчай літаратуры і выпуск бібліяграфічных паказальнікаў у бібліятэках на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.

Краязнаўства як адзін з асноўных кірункаў бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці ў пасляваенны перыяд у БССР. Стварэнне краязнаўчых аддзелаў і сектараў у абласных універсальных бібліятэках (АУБ),напрамкі і формы работы.

Арганізацыйная і інфармацыйна-рэсурсная база бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства на сучасным этапе (з пачатку 1990-х гг.). Стварэнне краязнаўчых цэнтраў і сектараў у публічных бібліятэках, краязнаўчых куткоў у сельскіх бібліятэках, музейных экспазіцый. Удасканаленне краязнаўчых фондаў бібліятэк, фарміраванне калекцый краязнаўчых дакументаў. Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк у лічбавым асяроддзі. Прамоцыя краязнаўчых ведаў у розных камунікатыўных фарматах; значэнне праектнай дзейнасці і рэкламы.Актывізацыя навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве.

## Раздзел II.Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ў сістэме краязнаўчай дзейнасці на сучасным этапе

*Тэма 5. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: сутнасць і структура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмінасістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, яго прынпыпы. Краязнаўчая функцыя бібліятэкі. Уклад замежных і айчынных даследчыкаў у развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства (М. М. Шчэрбы, А. В. Мамантава, Н. М. Кушнарэнка, Н. М. Балацкай, Л. Г. Тараненка, Л. Р. Амяльковіч, Т. В. Кузьмініч, А. В. Прадзеінай, І. М. Стрыжонак і інш.).

Структура бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Краязнаўчая практычная дзейнасць бібліятэкі– базавая падсістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства яккомплексная тэарэтыка-прыкладная дысцыпліна, яе прадмет і структура. Краязнаўчае бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства – тэарэтычная падсістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

Кампетэнцыі сучаснага спецыяліста ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

*Тэма 6. Арганізацыйна-функцыянальная структура краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці*

Роля IFLA ў вызначэнні напрамкаў і мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

Сектар краязнаўства і праектнай работыНацыянальнай бібліятэкі Беларусі, удзел іншых структурных падраздзяленняў бібліятэкі ўразвіцці бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.Абласныя ўніверсальныя бібліятэкі як рэгіянальныя цэнтры краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай работы ў краіне. Асноўныя напрамкі дзейнасці аддзелаў краязнаўства, іншых структурных падраздзяленняў, функцыянальныя абавязкі іх спецыялістаў. Арганізацыя і асноўныя напрамкі краязнаўчай дзейнасці публічных бібліятэк, функцыі спецыялізаваных сектараў (цэнтраў) і асноўных структурных падраздзяленняў, абавязкі бібліёграфаў. Удзел спецыяльных бібліятэк (установ вышэйшай адукацыі, школьных, тэхнічных і інш.) у краязнаўчай рабоце, яе асноўныя напрамкі.Забеспячэнне краязнаўчай дзейнасці бібліятэк нарматыўна-метадычнай, тэхналагічнай, арганізацыйнай дакументацыяй.

Міжбібліятэчнае ўзаемадзеянне і ўзаемадзеянне бібліятэк з іншымі ўстановамі і арганізацыямі ў стварэнні і выкарыстанні

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў, прамоцыі краязнаўчай інфармацыі.

Арганізацыя краязнаўчай дзейнасці ў замежных нацыянальных, навуковых і публічных бібліятэках; спецыялізаваныя краязнаўчыя бібліятэкі.

*Тэма 7. Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі*

Тыпалогія карыстальнікаў краязнаўчай інфармацыі і паслуг бібліятэкі ўзалежнасці ад відаў іх дзейнасці. Дыферэнцыя інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў (прафесіянальныя, навуковыя і аматарскія)і іх характарыстыка.Выяўленыя і нявыяўленыя інфармацыйныя краязнаўчыя патрэбнасці. Віды чытання краязнаўчай літаратуры.

Формы ўдзелу мясцовага насельніцтва ў рэалізацыі мэт краязнаўчай дзейнасці бібліятэкі.

*Тэма 8. Краязнаўчы фонд бібліятэкі*

Паняцці«краязнаўчы фонд», «краязнаўчы дакумент», «мясцовы дакумент». Структура краязнаўчага фонду, прынцыпы фарміравання. Падыходы да ўключэння краязнаўчых і мясцовых выданняў, электронных копій неапублікаваных дакументаў, сеткавых краязнаўчых рэсурсаў. Характарыстыка асноўных тэхналагічных этапаў фарміравання краязнаўчага фонду і асаблівасці рэалізацыі ў АУБ, публічных і спецыяльных бібліятэках.

Фарміраванне паўнатэкставых краязнаўчых калекцый, актуальнасць іх інтэграцыі ў нацыянальную электронную бібліятэку Беларусі.

*Тэма 9. Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі*

Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат(КДБА) бібліятэкі як інфармацыйна-пошукавая сістэма, ягоструктура і склад у бібліятэках розных тыпаў і відаў; формы існавання яго кампанентаў; прадстаўленне ў аддаленым доступе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Універсальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя БД і БД мясцовых дакументаў як элементы электронных каталогаў у бібліятэках Беларусі. Параўнанне айчынных тэхналогій з практыкамі фарміравання электронных краязнаўчых каталогаў за мяжой. Універсальныя («энцыклапедычныя») БД аб рэгіёне, якія камплексіруюць бібліяграфічную, фактаграфічную і паўнатэкставую інфармацыю. Анатаваныя навігатары тыпу«Рэгіён у Інтэрнэце».Картачныя краязнаўчыя каталогі (КК) і каталогі мясцовых выданняў; універсальныя краязнаўчыя картатэкі.

Прызначэнне і склад краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага фонду. Фонд неапублікаваных краязнаўчых дакументаў (электронныя архівы выкананых краязнаўчых даведак).

Краязнаўчы сегмент БД уласнай генерацыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Інтэграцыя краязнаўчых бібліяграфічных БД у зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі.

### *Тэма 10. Падрыхтоўка краязнаўчай інфармацыйнайпрадукцыі*

Сістэмны падыход пры фарміраванні краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў (рэсурсаў) бібліятэкі. Асноўныя структурныя элементы ў іх складзе, камунікатыўныя фарматы іх рэалізацыі.

Спецыфіка бібліяграфавання інфармацыйных аб'ектаў у кантэксце асноўных тэхналагічных этапаў падрыхтоўкі краязнаўчых інфармацыйных прадуктаў. Метадычныя асаблівасці асобных жанраў рэкамендацыйных і навукова-дапаможных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў**.**

Апісанне факта, распрацоўка структуры фактаграфічнага апісання (персоны, гістарычнай падзеі, даты і інш.). Асаблівасці фактаграфічных запісаў у розных жанрах інфармацыйнай прадукцыі.Агульная характарыстыка тыпаў фактаграфічнай інфармацыйнай прадукцыі, ствараемай у бібліятэках.

Стварэнне комплексных універсальных, буйных біябібліяграфічных, праблемна-тэматычных ЭІР – галоўны напрамак дзейнасці бібліятэк. Метадычныя асаблівасці і тэхналогія БД тыпу «Краязнаўчая энцыклапедыя», «Краязнаўчы каляндар», «Літаратурная карта рэгіёна», БД мясцовага друку, пуцевадзіцеляў (навігатараў) па краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах і інш. Прадстаўленне краязнаўчага бібліяграфічнага кантэнту ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лентах навін. Карпаратыўныя (зводныя) краязнаўчыя БД. Лінгвістычнае забеспячэнне краязнаўчых БД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў*

Сістэма бібліятэчнага абслугоўвання па краязнаўстве ў бібліятэках розных тыпаў і відаў.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне па краязнаўстве ў традыцыйнай і электронных формах. Віртуальныя даведачныя службы тыпу «Хуткая дапамога бібліёграфа-краязнаўцы», архіў выкананых даведак.

Прэваліраванне фактаграфічных даведак у патоку запытаў карыстальнікаў па краязнаўстве. Крыніцы і тэхналогія выканання фактаграфічных даведак (падзейна-храналагічных, персанаграфічных, адрасных, статыстычных і інш.). Крыніцы і тэхналогія выканання бібліяграфічных даведак розных відаў і зместу (тапанімічных, генеалагічных, персанаграфічных і інш.).

Асноўныя рэсурсы, сродкі і формы бібліяграфічнага інфармавання па праблемах краязнаўства і рэгіянальнага развіцця.

Каардынацыя дзейнасці бібліятэк з іншымі сацыяльнымі інстытутамі па задавальненні інфармацыйных патрэбнасцей насельніцтва па краязнаўстве.

*Тэма 12. Дзейнасць бібліятэкі па распаўсюджванні краязнаўчых ведаў*

Кампанентная структура распаўсюджвання краязнаўчых ведаў у бібліятэцы ў залежнасці ад мэт трансляцыі краязнаўчых ведаў і спосабаў арганізацыі камунікатыўнага ўзаемадзеяння з насельніцтвам і асобнымі групамі спажыўцоў інфармацыі.Характарыстыка франтальнага, гульнявога, прэзентацыйнага, праектнага, конкурснага і лекцыйнага кампанентаў. Разнастайнасць форм прамоцыі краязнаўчых ведаў у межах асобных кампанентаў; выкарыстанне сучасных камунікатыўных фарматаў; прыклады перадавой практыкі.

*Тэма 13. Краязнаўчая інфармацыя на вэб-сайтах бібліятэк і ў сацыяльных медыя*

Значэнне прамоцыі краязнаўчай інфармацыі аб рэгіёне ў лічбавым асяроддзі. Арганізацыя краязнаўчай інфармацыі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вэб-сайтах бібліятэк: стварэнне бібліятэкамі краязнаўчых парталаў і сайтаў; раздзелаў «Краязнаўства» на сайтах. Змест, наяўнасць тыповых элементаў, структураванасць і звязанасць кантэнту. Параўнальны аналіз практык перадавых замежных бібліятэк і айчынных бібліятэк. Актуальнасць пашырэння «геаграфічных уваходаў» да масіву краязнаўчых рэсурсаў, удасканаленне звязанасці рэсурсаў, выкарыстання гіперспасылак, прадстаўлення новых запатрабаваных карыстальнікамі інфармацыйных рэсурсаў, бягучай карэкціроўкі кантэнту.

Краязнаўчая інфармацыя ў сацыяльных медыя. Стварэнне груп; арганізацыя спасылак да рэсурсаў і сэрвісаў, якія забяспечваюць доступ да краязнаўчай інфармацыі; арганізацыя дыскусій і абмеркаванняў крыніц краязнаўчай інфармацыі, падбор цытат аб краі і інш.

*Тэма 14. Навукова-даследчая і метадычная дзейнасць бібліятэкі па краязнаўстве*

Навукова-даследчая і навукова-метадычная дзейнасцьпа краязнаўстве як кірункі дзейнасці бібліятэкі. Характар і асноўныя тэматычныя напрамкі навукова-даследчай дзейнасці ў айчынным бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве. Формы арганізацыі і вынікі навукова-даследчай дзейнасці і іх публікацыя: міжнародныя канферэнцыі і чытанні ў абласных, публічных бібліятэках, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, зборнікі матэрыялаў канферэнцый і інш. Спецыфіка пошукава-даследчай дзейнасці ў замежным бібліятэчным краязнаўстве.

Метадычнае забеспячэнне і павышэнне кваліфікацыі бібліятэкараў па напрамку бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Значэнне кіраўніцтваў па краязнаўчай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін: лекцыі | семінарскія заняткі | практычныя заняткі | лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Уводзіны** | 0,5 | | | | | |
| **Раздзел I. Краязнаўства як грамадская з'ява** | | | | | | |
| *Тэма 1.* Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства | 2 | | | | | тэсціраванне |
| *Тэма 2.*Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах | 0,5 | | | | 2 | тэсціраванне |
| *Тэма 3.*Узнікненне і асноўныя этапы развіцця беларускага краязнаўства | 0,5 | | | | | прэзентацыі |
| *Тэма 4.*Асноўныя этапы развіцця і інтэгравання айчыннага бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства | 0,5 | | | | | эсэ |
| **Раздзел II.Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ў сістэме краязнаўчай дзейнасці на сучасным этапе** | | | | | | |
| *Тэма 5.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства: сутнасць і структура | 2 | | | | 2 | тэсціраванне |
| *Тэма 6.* Арганізацыйна-функцыянальная структура краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці | 2 | 2 | | | | выступленні на семінары |
| *Тэма 7.*Карыстальнікі краязнаўчай інфармацыі | 2 | | | | | эсэ |
| *Тэма 8.*Краязнаўчы фонд бібліятэкі | 2 | | 2 | | 2 | тэсціраванне, праверка практычных работ |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 9.*Краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі | 2 | 2 | 2 | | 2 | прэзентацыі, ацэнка выступленняў на семінары іпрактычных работ |
| *Тэма 10.*Падрыхтоўка краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі | 2,5 | 2 | | 10 | | ацэнка выступленняў на семінары ілабараторных работ |
| *Тэма 11.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў | 2 | | 2 | | | праверка практычных работ |
| *Тэма 12.*Дзейнасць бібліятэкі па распаўсюджванні краязнаўчых ведаў | 2,5 | 2 | 6 | | 4 | ацэнка праектаў, выступленняў на семінары,групавое абмерка-ванне |
| *Тэма 13.*Краязнаўчая інфармацыя на вэб-сайтах бібліятэк і ў сацыяльных медыя | 1 | | | | 2 | праверка індывідуальных заданняў |
| *Тэма14.* Навукова-даследчая і навукова-метадычная дзейнасць бібліятэкі па краязнаўстве | 2 | | 2 | | | праверка індывідуальных заданняў |
| **Усяго…** | **24** | **8** | **14** | **10** | **14** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Ажеева, Р.Б.* Историко-краеведческая деятельность публичных библиотек : учеб. пособие / Р. Б. Ажеева. – М. : Литера, 2011. – 105 с. – (Серия «Современная библиотека» ; вып. 88).

*2. Балацкая, Н.М.* Библиотечное краеведение / Н. М. Балацкая // Библиотечная энциклопедия / РГБ. – М., 2007. – С. 198–199.

*3.*Библиотечное краеведение : терминолог. словарь / сост.: В. С. Крейденко, А. В. Мамонтов. – СПб., 1998. – 85 с.

*4. Демидова, С.Е.* Краеведческий документ : библиотечная обработка : учеб.-практ. пособие / С. Е. Демидова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. –104 с. – (Серия «Библиотекарь и время. XXI век»).

*5.*Краеведческая составляющая библиотечно-библиографического обслуживания // Справочник библиотекаря / науч. ред.: А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – Изд. 3-е, перераб. и доп. – СПб., 2006. – С. 171–176. – (Библиотека).

*6.* Краеведческие указатели и БД // Справочник библиографа. – Изд. 4-е, перераб. и доп. – СПб., 2014. – С. 552–564.

*7. Криворотенко, С. Н.* Краеведческий фонд библиотек : учеб. пособие / С. Н.Криворотенко. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 64 с.

*8. Михлина, И.И.* Основные понятия краеведческой библиографии : учеб.-метод. пособие / И. И. Михлина. – М. : ИПО Профиздат, 2002. – 80 с.

*9. Неверова, Т.А.* Краеведческая деятельность библиотек : учеб.-метод. пособие / Т. А. Неверова. – М. : Либерея, 2005. – 136 с. – (Библиотекарь и время. XXI век. Вып. 28).

*10. Саітава, В.І.* Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства / В. І. Саітава // Гісторыя краязнаўства Беларусі. – Мінск, 2009. – С.44–46, 73–74, 130–132, 143–148, 167–170, 192–195.

*11. Саітава, В.І.* Краязнаўства / В.І. Саітава // Культура Беларусі :энцыкл. Т. 4 / рэдкал. : У. Ю. Аляксандраў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 567–569.

*12. Саітава, В.І.*Сучасныя тэндэнцыі развіцця бібліятэчнага краязнаўства ў лічбавым фармаце: беларускі вопыт [Электрон. рэсурс] / В. І. Саітава, С. В. Зыгмантовіч //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Весн.БДУКМ. – 2018. – № 2 (30). – С. 149–156. – Рэжым доступу: URI:http://repository.buk.by/123456789/19192.

*13. Сомова, Т.Н.* Краеведческая деятельность детской библиотеки : учеб.-практ. пособие / Т. Н. Сомова ; Орловский гос. ин-т искусств и культуры. – М. : Либерея-Бибинформ, 2006. – 88 с.

*14.*СТБ ГОСТ 7.0-2004. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні=Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Узамен ГОСТ 7.0-84, ГОСТ 7. 26-80 ; уведз. 2005-03-01. – Мінск, 2004. – 35 с.

*Дадатковая*

*1. Балацкая, Н.М.* Краеведческая деятельность региональных библиотек: новая модель / Н. М. Балацкая, А. М. Ковалева, М. Б. Мартиросова // Библиография. – 2017. – № 5. – С. 38–43.

*2.*Бібліятэчнае краязнаўства : прастора вялікіх магчымасцей і перспектыў : зб. навук. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Т. В. Кузьмініч. – Мінск, 2013. – 286 с.

*3. Гендина, Н.И.* Краеведческий цифровой контент центральных библиотек субъектов Российской Федерации как объект потенциального роста обращений пользователей / Н. И. Гендина, Н. И. Колкова, Л. Н. Рябцева // Научные и технические библиотеки. – 2020. – № 7. – С. 49–70.

*4. Зыгмантовіч, С. В.*Навуковая дзейнасць па краязнаўстве як увасабленне культурнай місіі бібліятэкі / С. В. Зыгмантовіч, В. І. Саітава // Весн. Беларус. дзярж.ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 1 (21). – С. 119–125.

*5. Ігнатовіч, М.* Краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці / М. Ігнатовіч // Бібліятэчны свет. – 2018. –№ 6. – С.21–22.

*6.*Краеведение: потенциал развития в XXI веке : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 125-летию Алтайской краевой универсальной научной библиотеки им. В. Я. Шишкова, Барнаул, 14–18 окт. 2013 г. [Электрон. дан.]. – Режим доступа: http://akunb.altlib.ru/files/electr/akunb125.pdf.

*7.*Краязнаўчая дзейнасць бібліятэк : метад. рэкамендацыі / Нац. б-ка Беларусі; склад.: Р. М. Чыгірова, М. У. Сокал. – Мінск, 1994. – 102 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*8.*Материалы XVII Всерос. науч.-практ. семинара (г. Рязань, 4–7 окт. 2016 г.). – Рязань : Рязанская обл. тип., 2017. – 412 с. : ил. [Электрон. дан.]. – Режим доступа: http://info.rounb.ru/elbibl/kray/materialykonf2016.pdf.

*9.*Метадычныя падыходы да выяўлення рэгіянальных дакументаў і адлюстравання іх у электронным інфармацыйным рэсурсе «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі» // Нацыянальная бібліяграфія Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання электронных інфармацыйных рэсурсаў. – Мінск, 2016. – С. 76–80 ; Методыкаіндэксавання беларусазнаўчых і краязнаўчых дакументаў.– С. 85–102.

*10.*Проблемы краеведческой деятельности библиотек : материалы XV и XVI Всерос. науч.-практ. семинаров (г. Владимир, 6–9 окт. 2014 г.; г. Пермь, 5–8 окт. 2015 г.). – СПб. : Рос. нац. б-ка, 2016. – 712 с.

*11.*Проблемы краеведческой деятельности библиотек : материалы XVIII Всерос. науч.-практ. семинара (г. Омск, 3–6 окт. 2018 г.) / РНБ, РБА, Ом. гос. обл. науч. б-ка им. А. С. Пушкина ; сост. и науч. ред. Н. М. Балацкая, ред. С. А. Давыдова. – СПб., 2018. – 403 с.

*12. Протопопова, Е.Э.*Кросс-медийные технологии и краеведческая библиография / Е. Э. Протопопова // Научные и технические библиотеки. – 2017. – № 3. – С. 34–42.

*13.*Руководство по краеведческой деятельности общедоступных (публичных) библиотек РФ.Электрон. дан. : принято на Всерос. библ. конгрессе XXIII ежегодной конф. РБА (г. Владимир, 17 мая 2018 г.) / Рос. нац. б-ка. – [Электрон. дан.]. – Режим доступа: http://www.rba.ru/content/about/doc/ruk_kraevpub.pdf. – Загл. с экрана. – 28 с.

*14.*Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ.Электрон. дан. / Рос. библ. ассоц. – Электрон. дан. – М., 2017. – Режим доступа: http://www.rba.ru/cms_rba/news/uploadfiles/news/2017/14_04/ruk_kraeved.pdf.

*15. Стрыжонак, І.М.*Краязнаўчая функцыя бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута грамадства / І. М. Стрыжонак, В. І. Саітава // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. – Минск, 2008. – Вып. 2. – С. 681–686.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16.*Современная краеведческая деятельность библиотеки в цифровом формате : материалы межрегион. науч.-практ. конф., 25 сент. 2015 г., Челябинск. – Челябинск, 2015. –180 с.– Электрон. дан.– Режим доступа: http://chelreglib.ru/media/files/resources/editions/sovremennya_kraevedcheskaya_deyatelnost.pdf.

*17. Тараненко, Л.Г.* Внедрение информационно-коммуникационных технологий в библиотечное краеведение / Л. Г. Тараненко // Библиотековедение. – 2017. – Т. 66, № 3. – С. 263–270, 494.

*18. Тараненко, Л.Г.* Краеведческий справочно-поисковый аппарат / Л. Г. Тараненко // Моргенштерновские чтения – 2016. Библиотеки регионов в цифровую эпоху: управление, ресурсы, технологии : материалы Всерос. науч.-практ. конф. (г. Челябинск, 6–7 окт. 2016 г.). – Челябинск, 2017. – С. 174–181.– Электрон. дан. – Режим доступа: https://elibrary.ru/item.asp?id=29168416.

*19. Тараненко, Л.Г.* Технология создания электронного краеведческого каталога: трансформации в условиях электронной среды / Л. Г. Тараненко // Научные и технические библиотеки. – 2019. – № 2. – С. 5–17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў (СРС) уключае выкананне даследчых заданняў, распрацоўку розных відаў інфармацыйных прадуктаў і бібліятэчных мерапрыемстваў, падрыхтоўку бібліятэчнага краязнаўчага праекта. Заданні для самастойнай работы арыентуюць студэнтаў на самастойны пошук і выкарыстанне адкрытых краязнаўчых рэсурсаў, у тым ліку замежных. Самастойная работа ахоплівае ўсе тэмы вучэбнай дысцыпліны. Вынікі гэтай работы рэкамендуецца прадставіць у выглядзеэлектроннай прэзентацыі (не менш 12 слайдаў); эсэ (не менш за 3 старонкі тэксту); тэстаў, індывідуальных даследчых заданняў і краязнаўчага бібліятэчнага праекта. Індывідуальныя даследчыя заданні прапануюцца выкладчыкам з улікам інтарэсаў студэнтаў. Адной з найбольш эфектыўных форм самастойнай работы з’яўляецца распрацоўка і рэалізацыя краязнаўчага праекта актуальнай тэматыкі. Праект арыентаваны на прамоцыю краязнаўчых ведаў і ўключае комплекс мерапрыемстваў розных відаў і форм.Асаблівую ўвагу пры выкананні ўсіх тэм студэнтамнеабходна звярнуць на вывучэнне літаратуры па бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве, спецыялізаваныя сайты/парталы айчынных і замежных бібліятэк, раздзелы сайтаў, лічбавы краязнаўчы кантэнт, якія дапамогуць засвоіць дасягненні бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, паспрыяюць пераймanню інавацыйных форм работы і выкананню заданняў самастойнай работы. Заданні СРС могуць выконвацца ў розных камунікатыўных фарматах, што залежыць ад характару задання, але ў большасці заданняў магчыма выкарыстаць электронную форму. У ходзе падрыхтоўкі заданняў СРС студэнт выкарыстоўвае вусныя тлумачэнні выкладчыка і метадычныя распрацоўкі па кожнай тэме, а таксама звяртаецца да выкладчыка для атрымання кансультацый.

Пры абмеркаванні вынікаў СРС неабходна звяртаць асаблівую ўвагу на тое, як студэнтамі ўлічаны від/тып бібліятэкі, якія мэты ставіліся, якія крыніцы і метады былі выкарыстаны.Вынікі самастойнай работы студэнтаў, іх якасны ўзровень ўлічваюцца пры фарміраванні выніковага бала па дысцыпліне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыківынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступныя сродкі дыягностыкі:

– франтальнае апытанне на лекцыях;
– тэставы рубежны кантроль;
– падрыхтоўка электронных прэзентацый;
– вуснае апытанне студэнтаў на семінарскіх занятках;
– праверка заданняў, выкананых на практычных і лабараторных занятках;
– улік вынікаў СРС;
– экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-23 01 11*
*Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2021. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,33. Ул.-выд. арк. 0,86. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ